# Тематический раздел

# Тэматычны раздзел

# Special topic section

## К 160-летию отмены крепостного права в Российской империи

## Да 160-годдзя адмены прыгоннага права ў Расійскай імперыі

## On the 160th anniversary of the abolition of serfdom in the Russian Empire

*УДК 94(476)«1861/1914»*

# НАЧАЛО ТРАНСФОРМАЦИИ БЕЛОРУССКОЙ ДЕРЕВНИ

***А. Г. КОХАНОВСКИЙ*** [1)]

[1)] *Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Рассмотрено начало системной трансформации белорусской деревни, ее перехода от традиции к модерну, что охватил социально-экономическую организацию, культурную жизнь, демографическое поведение, глубинные процессы идентификации крестьянства, связанные с отменой крепостного права, которая, в свою очередь, была первой и важнейшей в ряду буржуазных реформ. Акцентируется внимание, что крепостное хозяйство в Беларуси накануне его ликвидации было распространено шире, чем во многих других регионах Российской империи. Показаны механизм реализации крестьянской реформы 1861 г., его особенности в Беларуси, охарактеризовано поземельное устройство различных категорий сельских жителей. Утверждается, что изменения в условиях отмены крепостного права на территории Беларуси, которые были реализованы властями Российской империи в связи с восстанием 1863 г., имели по глубине последствий фактически характер самостоятельной реформы. Делается вывод, что главный итог реформы 1861 г. – раскрепощение личности крестьянина, а судьба модернизационных процессов в Беларуси во второй

**Образец цитирования:**
Каханоўскі АГ. Пачатак трансфармацыі беларускай вёскі. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя.* 2021;1:7–14.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2021-1-7-14

**For citation:**
Kakhanouski AG. The beginning of transformation of the Belarusian village. *Journal of the Belarusian State University. History.* 2021;1:7–14. Belarusian.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2021-1-7-14

**Автор:**
***Александр Геннадьевич Кохановский*** – доктор исторических наук, профессор; декан исторического факультета.

**Author:**
***Aliaksandr G. Kakhanouski***, doctor of science (history), full professor; dean of the faculty of history.
*kohanovsky@bsu.by*

CC BY NC

половине XIX – начале XX в. зависела прежде всего от степени включенности в них сельских жителей, которые стали в результате реформы субъектами социально-экономических, общественно-политических, культурных процессов.

***Ключевые слова:*** Беларусь; белорусские губернии Российской империи; отмена крепостного права; трансформационные изменения в деревне; крестьянство.

## ПАЧАТАК ТРАНСФАРМАЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ ВЁСКІ

***А. Г. КАХАНОЎСКІ*** [1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Разгледжаны пачатак сістэмнай трансфармацыі беларускай вёскі, яе пераходу ад традыцыі да мадэрну, што закрануў сацыяльна-эканамічную арганізацыю, культурнае жыццё вёскі, дэмаграфічныя паводзіны, глыбінныя працэсы ідэнтыфікацыі сялянства, звязаныя з адменай прыгоннага права, якая, у сваю чаргу, была першай і важнейшай у шэрагу буржуазных рэформ. Акцэнтуецца ўвага на больш шырокім распаўсюджанні, чым у многіх іншых рэгіёнах Расійскай імперыі, прыгоннай гаспадаркі напярэдадні яе скасавання. Паказаны механізм рэалізацыі сялянскай рэформы 1861 г., яго асаблівасці ў Беларусі, ахарактарызавана пазямельнае ўладкаванне розных катэгорый сельскіх жыхароў. Сцвярджаецца, што змены ва ўмовах адмены прыгоннага права на тэрыторыі Беларусі, якія былі здзейснены ўладамі Расійскай імперыі ў сувязі з паўстаннем 1863 г., мелі па глыбіні наступстваў фактычна характар самастойнай рэформы. Робіцца выснова, што галоўны вынік рэформы 1861 г. – разняволенне асобы селяніна, а лёс мадэрнізацыйных працэсаў у Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. залежаў перш за ўсё ад ступені ўключанасці ў іх сельскіх жыхароў, якія сталі ў выніку рэформы суб'ектамі сацыяльна-эканамічных, грамадска-палітычных і культурных працэсаў.

***Ключавыя словы:*** Беларусь; беларускія губерні Расійскай імперыі; адмена прыгоннага права; трансфармацыйныя змены ў вёсцы; сялянства.

## THE BEGINNING OF TRANSFORMATION OF THE BELARUSIAN VILLAGE

***A. G. KAKHANOUSKI*** [a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

The article presents the beginning of the systemic transformation of the Belarusian village, its transition from tradition to modernity linked with the abolition of serfdom, which in its turn was the first and most important reform together with other bourgeois reforms. Transformation of the village embraced the socio-economic organisation, cultural life of the village, demographic behaviour, ingrained peasantry identification. The author draws attention to the fact that economy based on serfdom in Belarus shortly before its abolition was more widely represented than in many other regions of the Russian Empire. The author goes on to show the process of implementation of the reform of 1861, its peculiarities in Belarus. Also the land arrangement of various categories of peasantry is characterised. The author states that in conditions of abolition of serfdom on the territory of Belarus changes carried out by the authorities of the Russian Empire owing to the uprising of 1863 actually had the nature of an independent reform in terms of intensity of their consequences. The author concludes that the main result of the reform of 1861 was the attainment by peasants of personal liberty, while the fate of modernisation processes in Belarus in the second half of the 19$^{th}$ – the beginning of the 20$^{th}$ century, first of all, depended on the degree of involvement peasants in these processes, who consequently became subjects of socio-economic, socio-political and cultural processes.

***Keywords:*** Belarus; Belarusian governorates of the Russian Empire; the abolition of serfdom; transformation of the village; the peasantry.

### Уводзіны

Традыцыйная беларуская вёска зведала шмат рэформ. Моцнае ўздзеянне на яе развіццё аказалі і пераход да фальваркова-паншчыннай гаспадаркі ў XVI ст., і правядзенне інвентарнай рэформы ў памешчыцкай вёсцы, і люстрацыя дзяржаўных уладанняў у першай палове XIX ст. Іх уплыў, асабліва першай з названых, адчуваўся нават у пачатку XX ст. Аднак сістэмную трансфармацыю, якая

закранула не толькі сацыяльна-эканамічную арганізацыю, але і культурнае жыццё, дэмаграфічныя паводзіны, глыбінныя працэсы ідэнтыфікацыі сялянства, беларуская вёска зведала ў сувязі з пераходам ад традыцыі да мадэрну. Пачатак гэтаму працэсу, што расцягнуўся на дзесяцігоддзі, паклала адмена прыгоннага права. Яна стала першай і важнейшай у шэрагу буржуазных рэформ у Расійскай імперыі. З моманту падпісання 19 лютага 1861 г. заканадаўчых дакументаў аб вызваленні прыгонных сялян, заклiканых выравшыць іх імкненне да зямлі і волі, мінула 160 гадоў.

## Метадалогія і гістарыяграфія даследавання

Правядзенне сялянскай рэформы стала хрэстаматыйнай тэмай для ўсіх без выключэння вучэбных выданняў па айчыннай гісторыі XIX – пачатку XX ст., ад школьных да ўніверсітэцкіх. Аднак да сённяшняга дня няма сучаснай спецыяльнай працы аб адмене прыгоннага права ў Беларусі. Больш за тое, сярод даследчыкаў нярэдка адсутнічае адзінства ў вызначэнні перадумоў, ступені падрыхтаванасці, характару і вынікаў адмены прыгоннага права ў суаднясенні са ступенню задаволенасці галоўнага адрасата рэформы – сялянства. У беларускай гістарыяграфіі найбольш вядомымі з'яўляюцца перш за ўсё два спецыяльныя даследаванні па адмене прыгоннага права ў Беларусі – працы М. Б. Фрыдман [1] і М. М. Улашчыка [2], якія былі створаны ў сярэдзіне мінулага стагоддзя. Уплыў сялянскай рэформы на далейшае развіццё беларускай вёскі знайшоў адлюстраванне ў даследаваннях Л. П. Ліпінскага [3], В. П. Панюціча [4; 5] і інш. У савецкай і сучаснай беларускай гістарыяграфіі сялянская рэформа разглядалася пераважна на старонках раздзелаў абагульняючых навуковых выданняў, навучальных дапаможнікаў, манаграфічных даследаванняў, прысвечаных сацыяльна-эканамічнаму развіццю беларускай вёскі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. [6–11]. Па-за ўвагай даследчыкаў засталіся пытанні сацыяльна-прававога становішча прыгонных сялян напярэдадні рэформы, раскрыцця механізма практычнай рэалізацыі сялянскай рэформы ў Беларусі, дэтальнага вывучэння сельскай грамады, асаблівасцей яе функцыянавання як важнага інстытута жыцця паслярэформеннай вёскі, а таксама дзейнасці міравых пасрэднікаў па ўрэгуляванні спрэчных пытанняў паміж памешчыкамі і сялянамі. У айчынным гістарыяграфічным дыскурсе нярэдка прысутнічае негатывісцкі, часам спрошчаны падыход у ацэнцы вынікаў сялянскай рэформы. У гэтым сэнсе характэрнай для савецкай і часткова для сучаснай беларускай гістарыяграфіі з'яўляецца пазіцыя аўтараў адпаведнага раздзела другога тома выдання «Гісторыя сялянства Беларусі» адносна характару і вынікаў рэформы 1861 г. Яны звяртаюць увагу на «прыгонніцкую сутнасць урадавай праграмы вызвалення сялян», грабежніцкія ўмовы рэформы, калі за сялянамі былі замацаваны «недастатковыя і часта недабраякасныя надзелы» [8, с. 42, 62]. У выніку робіцца выснова, што рэформа «была самай буйной уступкай прыгоннікаў і іх дзяржавы, з дапамогай якой яны спадзяваліся адстаяць і пры капіталізме ў непарушным стане панскае землеўладанне і самадзяржаўе» [8, с. 115]. Больш узважана, з улікам складанасцей падрыхтоўкі, недасканаласцей рэалізацыі і велізарнага станоўчага значэння для далейшага развіцця беларускай вёскі адмена прыгоннага права на аснове выкарыстання вялікай колькасці крыніц і сучасных гістарыяграфічных падыходаў паказана ў раздзеле, падрыхтаваным А. Ф. Рацько, у калектыўным выданні «Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.)» [12].

Стварэнне цэласнай карціны рэалізацыі сялянскай рэформы ў Беларусі, вызначэнне яе глыбіні і паслядоўнасці, ступені задаволенасці галоўнага адрасата, вырашэнне дыскусійных пытанняў тэмы на сёняшні дзень патрабуюць пераасэнсавання вялізнага масіву крыніц, найперш матэрыялаў справаводства, статыстычных, этнаграфічных даных, крыніц асабістага паходжання. Акрамя агульнанавуковых і спецыяльна-гістарычных метадаў, даследаванне адмены прыгоннага права патрабуе выкарыстання тэорыі мадэрнізацыі і міждысцыплінарнага падыходу.

## Асноўная частка

У першай палове XIX ст. прыгонная гаспадарка ў Беларусі была распаўсюджана шырэй, чым у многіх іншых рэгіёнах Расійскай імперыі. Пасля далучэння да апошняй у Беларусі да пачатку XIX ст. значна скарацілася дзяржаўнае землеўладанне. Толькі ў заходняй яе частцы ў прыватную ўласнасць было перададзена больш за 42 тыс. душ сялян [2, с. 50]. Бліжэй да сярэдзіны XIX ст. колькасць дзяржаўных сялян пачала павялічвацца за кошт канфіскацыі памешчыцкіх і секулярызацыі царкоўных уладанняў. Напярэдадні адмены прыгоннага права ўдзельная вага памешчыцкага землеўладання ў беларускіх губернях складала 66,8 % ад агульнай плошчы ўгоддзяў. У той жа час гэты паказчык па еўрапейскай частцы Расійскай імперыі быў значна ніжэйшы – 24,7 % [12, с. 130]. Прыгонныя сяляне ў Віленскай губерні складалі 45,95 % ад агульнай колькасці насельніцтва, у Віцебскай – 57,08, Гродзенскай – 40,97, Мінскай – 60,74, Магілёўскай – 64,69 %. Па еўрапейскай частцы Расійскай імперыі

сярэдні паказчык удзельнай вагі прыгоннага сялянства быў ніжэйшы – 37,51 %[1]. Магілёўская губерня па велічыні згаданага паказчыка займала трэцюю пазіцыю ў Расійскай імперыі, Мінская – пятую, Віцебская – дванаццатую, Віленская – дваццатую, Гродзенская – дваццаць другую[2].

Наогул сярод сялянства Беларусі незадоўга да правядзення рэформы 1861 г. па прававым становішчы вылучаліся шэраг саслоўных разрадаў. Паводле даных 1858 г., памешчыцкія сяляне складалі 76,0 % ад іх агульнай колькасці, дзяржаўныя – 19,5, ленныя – 0,75, удзельныя – 0,68 % і інш. [5, с. 29]. Неаднародны склад вясковых жыхароў Беларусі стаў непасрэдным вынікам перапляцення ранейшых эканамічных адносін, якія ўсталяваліся яшчэ ў часы існавання Рэчы Паспалітай, і здзяйснення ўрадавай палітыкі Расійскай імперыі.

Варта падкрэсліць, што ўжо пасля адмены прыгоннага права ў 1863 г. у структуры сялянства беларускіх губерняў абсалютную большасць складалі былыя прыгонныя – 73,5 %, дзяржаўныя сяляне – 26,1, удзельныя сяляне – 0,4 % і інш.[3] У другіх рэгіёнах еўрапейскай часткі Расійскай імперыі гэтыя групы насельніцтва складалі адпаведна 46,8; 46,5 і 6,7 %. У Беларусі сярод сялян адчувальна большым быў працэнт былых прыгонных.

Ініцыятыва па адмене прыгоннага права ў Расійскай імперыі зыходзіла ад вярхоўнай улады. Аднак для правядзення сялянскай рэформы існавалі і аб'ектыўныя перадумовы. Многія землеўласнікі, асабліва ў заходніх губернях дзяржавы, паступова ўключаліся ў таварна-грашовыя адносіны, і захаванне прыгону для іх станавілася непажаданым. У Беларусі памешчыцкія гаспадаркі вылучаліся больш ранняй уцягнутасцю ў развіццё капіталістычных адносін, а таксама спалучэннем у іх вытворчасці сельскагаспадарчага і прамысловага кірункаў. Вопыт суседніх польскіх і прыбалтыйскіх губерняў, дзе ўжо даўно не існавала прыгоннага права, падказваў правільны шлях. Далейшае развіццё краіны, мадэрнізацыя яе эканомікі былі абмежаваны наяўнасцю пазаэканамічнага прымусу прыгонных сялян.

Для абмеркавання мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і рэалізацыі адмены прыгоннага права ў Расійскай імперыі імператар Аляксандр II стварыў у студзені 1857 г. Сакрэтны камітэт. Аднак упершыню аб жаданні скасаваць прыгонніцтва Аляксандр II заявіў яшчэ ў сакавіку 1856 г. падчас сустрэчы з прадстаўнікамі маскоўскага дваранства [10, с. 11]. Ідэя вярхоўнай улады вызваліць сялянства выклікала вельмі стрыманую рэакцыю землеўласнікаў цэнтральных губерняў Расійскай імперыі. У такім выпадку імператар вырашыў звярнуцца за падтрымкай да памешчыкаў беларускіх і літоўскіх губерняў, якія папярэдне неаднаразова выказваліся за вызваленне сялян ад прыгону і мелі ўласныя праекты рэалізацыі рэформы. Стымулам для іх згоды пры абмеркаванні будучай рэформы стала непазбежнасць увядзення ў беларускіх губернях абавязковых інвентароў і ўрэгулявання адносін паміж прыгоннымі сялянамі і землеўласнікамі паводле правіл 1844 г., што магло абмежаваць самавольства памешчыкаў і выклікала іх незадаволенасць. Праз віленскага генерал-губернатара У. І. Назімава была арганізавана ініцыятыва віленскага, гродзенскага, ковенскага дваранства па адмене прыгоннага права. Пры гэтым мясцовыя землеўласнікі былі аднадушнымі ў адмаўленні абавязковага продажу сялянам апрацоўваемай імі зямлі па фіксаваных дзяржавай цэнах, што прапаноўваўся вярхоўнай уладай. Такая ідэя адпавядала расійскаму парадку ўраўняльнага землекарыстання, але, на думку памешчыкаў беларускіх і літоўскіх губерняў, супярэчыла мясцовай структуры эканамічнага жыцця, пры якім у вёсцы панавала падворнае землекарыстанне. Беларускія і літоўскія землеўласнікі лічылі больш прымальнай такую арганізацыю зямельных адносін у маёнтках, якая б стварала ўмовы для больш спрошчанай арэнды зямлі і прыцягнення мясцовых сялян у якасці вольнанаёмнай рабочай сілы.

Сваю пазіцыю памешчыкі Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губерняў выклалі ў адрасах, якія ў верасні 1857 г. накіравалі імператару. У адказ на іх Аляксандр II звярнуўся 20 лістапада 1857 г. з рэскрыптам да віленскага генерал-губернатара У. І. Назімава, якім афіцыйна дазволіў абмяркоўваць праекты адмены прыгоннага права [10, с. 11]. У рэскрыпце насуперак жаданню беларускага і літоўскага дваранства прапаноўвалася перадаць сялянам іх сядзібы ва ўласнасць за грошы або за працу, а таксама ў карыстанне за аброк ці за паншчыну частку памешчыцкай зямлі для забеспячэння іх жыццёвых патрэб і спраўнага выканання абавязкаў перад дзяржавай і землеўласнікам [12, с. 143]. Сяляне, паводле гэтага дакумента, павінны былі атрымаць волю паступова. Акрамя таго, было прынята рашэнне аб стварэнні губернскіх дваранскіх камітэтаў для распрацоўкі праектаў адмены прыгону.

Рэскрыпт У. І. Назімаву афіцыйна паклаў пачатак падрыхтоўцы сялянскай рэформы ў Расійскай імперыі. Згода беларускіх і літоўскіх землеўласнікаў адмяніць прыгоннае права дала падставу расійскаму ўраду пашырыць мясцовую ініцыятыву на

[1]*Тройницкий А.* Крепостное население в России по 10-й народной переписи : стат. исслед. СПб. : Тип. К. Вульфа, 1861. С. 49.
[2]Там же. С. 85.
[3]Статистический временник Российской империи. Вып. 1. СПб., 1866. С. 50–51.

ўсю дзяржаву. У лютым 1858 г. Сакрэтны камітэт быў рэарганізаваны ў Галоўны камітэт па сялянскай справе. Да канца 1858 г. дваранскія камітэты былі створаны ва ўсіх губернях еўрапейскай часткі Расійскай імперыі. Зварот імператара Аляксандра II менавіта да беларускіх і літоўскіх памешчыкаў быў абумоўлены фактычна большай падрыхтаванасцю рэгіёна да вырашэння надзённага для дзяржавы сялянскага пытання.

Пачатак падрыхтоўкі рэформы выклікаў неаднaзначную рэакцыю з боку памешчыкаў. Многія з іх сустрэлі навіну з насцярожанасцю і трывогай, асабліва непакоіла неабходнасць прадставіць за выкуп сялянам іх сядзібную аселасць. Землеўласнікі пачалі абеззямельваць сялян, забіраць сабе лепшыя ўгоддзі. Частка прыгонных былі пераведзены ў дваровыя ці адпушчаны на волю, але без зямлі. Гэта выклікала пратэст з боку сялян і занепакоенасць з боку ўлад. Напрыклад, 21 лютага 1858 г. У. І. Назімаў быў вымушаны забараніць адпускаць на волю сялян без зямлі [12, с. 144]. Пазней міністр юстыцыі В. М. Панін пад уплывам незадаволенасці з боку памешчыкаў дазволіў вызваляць сялян без зямлі, але толькі з іх згоды, што, у сваю чаргу, часта парушалася.

19 лютага 1861 г. Аляксандр II падпісаў Маніфест аб адмене прыгоннага права і іншыя заканадаўчыя дакументы. На беларускія губерні пашыралася дзеянне агульнага і двух мясцовых палажэнняў. Паводле агульнага палажэння, сяляне атрымлівалі асабістую свабоду, станавіліся суб’ектамі права, маглі ад свайго імя заключаць грамадзянскія дамовы, весці судовыя справы, самастойна займацца промысламі і гандлем. Аднак гэта не азначала, што былыя прыгонныя сяляне былі ўраўнаванымі ў правах. Яны па-ранейшаму з’яўляліся саслоўем, якое абкладалася падаткамі. Памешчык заставаўся ўласнікам усёй зямлі, аднак частка яе перадавалася ў карыстанне сялянам. Да заключэння выкупной здзелкі былы прыгонны знаходзіўся ў часоваабавязаным стане і вымушаны быў выконваць на карысць землеўласніка агавораныя павіннасці. Пазямельныя адносіны паміж памешчыкам і часоваабавязанымі сялянамі рэгуляваліся ўстаўнымі граматамі.

Канкрэтны парадак землеўпарадкавання сялян і выканання імі павіннасцей рэгламентавалі мясцовыя палажэнні. На беларускія паветы Віцебскай і Магілёўскай губерняў распаўсюджвалася Палажэнне для губерняў вялікарасійскіх, новарасійскіх і беларускіх. Для Віленскай, Гродзенскай, Мінскай, а таксама Ковенскай губерняў улады выпрацавалі асобнае спецыяльнае палажэнне, што было абумоўлена пашырэннем тут падворнага землекарыстання і значнай актыўнасцю па ўвядзенні інвентароў.

У беларускіх паветах Віцебскай і Магілёўскай губерняў, дзе ў значна большай ступені прысутнічала абшчыннае землекарыстанне, зямельныя надзелы сялян вызначаліся ў залежнасці ад якасці глебаў: вышэйшы – ад 4 да 5,5 дзесяціны, ніжэйшы – 1/3 вышэйшага [10, с. 13]. Тут імкнуліся пакінуць той памер зямельных участкаў, якімі сяляне карысталіся да рэформы. Калі велічыня надзелу перавышала вышэйшы, то памешчык атрымліваў магчымасць адрэзаць частку на сваю карысць. Адным з рудыментаў ранейшай эпохі было захаванне ў абшчынах кругавой парукі для гарантаванага выканання сялянамі сваіх павіннасцей.

У Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях вясковым жыхарам перадавалася тая зямля, якой яны карысталіся да 1861 г. у адпаведнасці з уведзенымі інвентарамі. У тым выпадку, калі ў сялян зямлі заставалася больш, чым паказана ў інвентары, або калі ў памешчыка было менш 1/3 зручных зямель, апошні меў права адрэзаць на сваю карысць да 1/6 часткі сялянскага надзелу. Тут адпаведна з умовамі мясцовага палажэння выдзеленыя ўчасткі зямлі не маглі перадавацца несялянам[4]. У беларускіх губернях прадугледжвалася стварэнне ў кожным павеце паверачных камісій, якія на працягу шасці гадоў пасля зацвярджэння ўстаўных грамат разбіралі спрэчкі і рознагалоссі паміж сялянамі і памешчыкамі. Такі орган у велікарускіх губернях не ствараўся. Супраць дзейнасці паверачных камісій выступілі мясцовыя памешчыкі, якія бачылі ў гэтым абмежаванне сваіх маёмасных правоў. Зямля перадавалася сялянам ва ўласнасць праз выкуп. Выкупная аперацыя вызначалася агульнымі для ўсіх губерняў правіламі. Выкупная сума разлічвалася ў такім памеры, што ў выпадку ўкладання яе ў банк пры ўмове 6 % гадавых памешчык павінен атрымліваць даход, які быў роўны ранейшаму гадавому аброку.

Усе лясы пакідаліся ва ўласнасці памешчыкаў. Сяляне маглі нарыхтоўваць дровы толькі з іх дазволу і за пэўную плату. Дзяржава для ажыццяўлення выкупной аперацыі давала сялянам доўгатэрміновую грашовую пазыку. Вясковыя жыхары на 49 гадоў рабіліся даўжнікамі дзяржавы і павінны былі вяртаць доўг з улікам працэнтаў – так званых выкупных плацяжоў. На практыцы памер выкупу перавышаў фактычны кошт зямлі. Акрамя выкупных плацяжоў, сяляне вымушаны былі плаціць дзяржаве падаткі і зборы. Сумарна яны ў разліку на адну дзесяціну перавышалі выкупныя плацяжы.

Практычнымі мерапрыемствамі па ажыццяўленні рэформы займаліся міравыя пасрэднікі, якія павінны былі праверыць складзеныя ўстаўныя граматы, колькасць і якасць размежаваных угоддзяў [13, с. 44]. Міравыя пасрэднікі прызначаліся

[4]Статистика крестьянских дворов Виленской губернии. Вильно : Тип. А. Г. Сыркина, 1895. С. 5.

губернатарамі з ліку мясцовых памешчыкаў. Ім было падначалена сялянскае кіраўніцтва некалькіх валасцей. Яны нярэдка сумленна выконвалі ўскладзеныя на іх абавязкі, за што атрымлівалі скаргі з боку землеўласнікаў, асабліва калі вырашалі спрэчныя пытанні на карысць сялян.

Азнаямленне з умовамі адмены прыгоннага права праводзілася ў цэрквах і касцёлах у прысутнасці паліцыі. Незадавальненне выклікала ў сялян тое, што ім абяцалі толькі асабістую волю і то не адразу, а зямлю, на якой яны працавалі многія гады, неабходна было выкупаць у памешчыка. Сельскім жыхарам не спадабаўся двухгадовы пераходны перыяд, на працягу якога міравым пасрэднікам патрэбна было скласці ў кожным маёнтку ўстаўныя граматы.

Калі пачалося паўстанне 1863 г., расійскія ўлады стараліся пазбегнуць далучэння беларускіх сялян да паўстанцаў. Такое імкненне прымусіла ўрад пайсці на істотную радыкалізацыю ўмоў адмены прыгоннага права на тэрыторыі беларускіх і літоўскіх губерняў. Указам ад 1 сакавіка 1863 г. спыняліся часоваабавязаныя адносіны сялян у Віленскай, Гродзенскай, Мінскай, а таксама Ковенскай губернях і інфлянцкіх паветах Віцебскай губерні. 2 лістапада 1863 г. дзеянне ўказа было пашырана на Магілёўскую і беларускія паветы Віцебскай губерні. Гэтымі заканадаўчымі дакументамі сяляне пераводзіліся на абавязковы выкуп сваіх надзелаў і станавіліся сялянамі-ўласнікамі. Выкупныя плацяжы змяншаліся на 20 %, а зямельныя надзелы былі павялічаны. За сялянамі замацоўвалася права на сервітутныя ўгоддзі, якімі яны карысталіся да рэформы 1861 г. У выніку праведзеных змен сяляне Гродзенскай губерні атрымалі зямлі на 12 % больш у параўнанні з дарэформенным перыядам, Віленскай губерні – на 16, беларускіх паветаў Віцебскай губерні – на 17 % больш і г. д. [10, с. 14]. Акрамя таго, у адпаведнасці з указам ад 17 жніўня 1863 г. выдзяляўся абавязковы трохдзесяцінны надзел сялянам, абеззямеленым у перыяд з 1846 па 1857 г., а ўказам ад 18 кастрычніка 1863 г. гарантавалася поўнае вяртанне надзелаў тым, хто быў іх пазбаўлены пасля 1857 г. Змены, праведзеныя ў сувязі з паўстаннем 1863 г., па сваім значэнні і наступствах могуць ацэньвацца як самастойная рэформа.

Пасля адмены прыгоннага права для памешчыцкіх сялян Беларусі з'явілася неабходнасць пазямельнага ўладкавання іншых катэгорый сельскага насельніцтва. У маі 1867 г. быў прыняты закон, якім прадугледжвалася рэформа дзяржаўнай вёскі Беларусі, а таксама Літвы і Правабярэжнай Украіны [10, с. 14–15]. Паводле названага дакумента, землеўладкаванне дзяржаўных сялян праводзілася на той жа аснове, што і былых памешчыцкіх. Іх пераводзілі на абавязковы выкуп і прылічалі да сялян-уласнікаў. За дзяржаўнымі сялянамі Беларусі заставалася зямля, якая знаходзілася ў іх карыстанні да 1867 г. Памер зямельных надзелаў і сума выкупных плацяжоў за іх вызначаліся люстрацыйнымі камісіямі. Тэрмін пагашэння выкупнога доўгу складаў 46 гадоў. Ніякай фінансавай падтрымкі ад дзяржавы казённыя сяляне не мелі. Выкупныя плацяжы былі набліжаны па сваіх памерах да мясцовых рынкавых цэн на зямлю і былі ніжэй, чым у былых памешчыцкіх сялян. У сувязі з паўстаннем расійскі ўрад у чэрвені 1863 г. вымушаны быў перавесці ўдзельных сялян на абавязковы выкуп. Апошнія атрымалі некалькі большыя надзелы, чым дзяржаўныя сяляне, і кошт гэтых надзелаў быў меншым. У ліпені 1864 г. апублікавалі ўказ аб пазямельным уладкаванні вольных людзей. Нягледзячы на асабістую свабоду яны былі абавязаны плаціць падушны аброк ці адпрацоўваць за зямлю. Напярэдадні адмены прыгоннага права многіх з вольных людзей абеззямелілі. У гэту катэгорыю былі пераведзены мноства прыгонных сялян. Паводле ўказа 1864 г., вольныя людзі, абеззямеленыя памешчыкамі пасля лістапада 1857 г., надзяляліся зямлёй з правам выкупу на тых жа ўмовах, што і памешчыцкія сяляне, а пазбаўленыя зямлі да 1857 г. пакідаліся на 12 гадоў у якасці арандатараў [8, с. 107–108]. Адпаведна закону ад 9 чэрвеня 1886 г. на тэрыторыі Беларусі, Правабярэжнай Украіны і Літвы чыншавікоў пераводзілі на абавязковы выкуп. Законам 1893 г. права выкупіць зямлю было нададзена праваслаўным арандатарам.

Перавод на выкуп памешчыцкіх, а затым і дзяржаўных сялян Беларусі, землеўпарадкаванне іншых катэгорый сельскіх жыхароў стварылі больш спрыяльныя ўмовы для сацыяльна-эканамічнай трансфармацыі беларускай вёскі ў адрозненне ад многіх іншых губерняў еўрапейскай часткі Расійскай імперыі. Пасля адмены прыгоннага права пачаўся працэс кансалідацыі розных груп сялян у межах аднаго саслоўя. У той жа час у пачатку XX ст. яшчэ адчуваўся падзел сялянства на былых памешчыцкіх, дзяржаўных, дваровых і інш., што было абумоўлена супярэчлівасцю ўрадавых мерапрыемстваў, а таксама наяўнасцю традыцыйных рыс ідэнтыфікацыі сялянства [14, с. 209–210].

Пасля адмены прыгоннага права сялянам даводзілася вучыцца самастойна вырашаць гаспадарчыя пытанні, адстойваць свае правы праз грамаду. Архіўныя крыніцы змяшчаюць вялікую колькасць матэрыялаў, паводле якіх можна меркаваць аб слабых месцах паслярэформеннага жыцця сялян. Адной з самых актуальных праблем была неабходнасць за грошы ці адпрацоўку нарыхтоўваць дровы ў панскіх лясах, незадаволенасць выклікала неўрэгуляванасць пытання аб магчымасці карыстання сумеснымі ўгоддзямі (сервітутамі).

У сярэдзіне XIX ст. сяляне свой жыццёвы поспех звязвалі з заняткамі земляробствам і не прымалі «рознага роду промыслы»[5]. Правядзенне рэформы 1861 г., наступнае ўладкаванне іншых груп сельскіх жыхароў разняволілі сялянства, аднак у 1860–80-х гг. яго актыўнасць была звязана перш за ўсё з набыццём зямлі. У 1880–90-х гг. ва ўмовах сусветнага аграрнага крызісу адбыўся пералом у сацыяльна-эканамічным развіцці беларускай вёскі [15, с. 233]. Узрасла колькасць лішняй працоўнай сілы, многія прадстаўнікі сельскага насельніцтва імкнуліся працаваць у галіне прамысловасці. На мяжы XIX–XX стст. у сялян стала праяўляцца схільнасць да гаспадарчых навацый, прадпрымальніцтва [16, с. 25]. Акрамя таго, у той жа перыяд сялянства ахапілі працэсы сацыяльнай мабільнасці, перш за ўсё гарызантальнай, аднак з часам больш частымі становяцца выпадкі вертыкальнай.

## Заключэнне

У апошнія два дзесяцігоддзі на навуковых мерапрыемствах, прысвечаных юбілейным датам з нагоды адмены прыгоннага права, выказваліся розныя меркаванні адносна ступені падрыхтаванасці рэформы, узроўню эканамічнай эфектыўнасці прыгоннай гаспадаркі напярэдадні яе ліквідацыі і нават магчымасці далейшага яе функцыянавання. Аднак у ацэнцы сялянскай рэформы 1861 г. павінен брацца пад увагу перш за ўсё яе галоўны вынік – дэфеадалізацыя працы, разняволенне асобы селяніна. Нельга гаварыць аб станаўленні грамадзянскай супольнасці, нават яе элементаў, пакуль значная частка насельніцтва (а ў Беларусі гэта больш паловы ад агульнага ліку) праз свой прыгонны стан пазбаўлены звычайных чалавечых імпульсаў да самаразвіцця, магчымасці самастойна ўдзельнічаць у сацыяльна-эканамічным і грамадскім жыцці.

Лёс мадэрнізацыйных працэсаў у Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. залежаў перш за ўсё ад ступені ўключанасці ў іх сялянства. Адмена прыгоннага права адкрыла магчымасці глыбінных сацыяльных зрухаў у сельскім асяроддзі. Аднак пасапраўднаму сялянства адыграла вызначальную ролю ў разгортванні трансфармацыйных працэсаў у беларускім грамадстве толькі пад уплывам сусветнага аграрнага крызісу 1880-х гг., калі яно вымушана было ўлічваць у сваёй гаспадарчай дзейнасці тэндэнцыі развіцця таварна-грашовых адносін і рыначную кан'юнктуру. У сваю чаргу, гэта запатрабавала ад сялянства змяніць адносіны да адукацыі, уключыцца ў сацыяльна-культурныя і міграцыйныя працэсы, зведаць, што ёсць яшчэ іншыя жыццёвыя сцэнарыі, акрамя традыцыйнай прывязанасці да зямельнай гаспадаркі. І самае галоўнае: больш шырокая распаўсюджанасць прыгонніцтва на тэрыторыі Беларусі, параўнальна вялікая ўдзельная вага заняволенага сялянства сказаліся на працэсах станаўлення мадэрнавай беларускай нацыі, запозненасці гэтага працэсу, паколькі прыгонны селянін па вялікім рахунку не мог мець сфарміраваную нацыянальную ідэнтыфікацыю.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Фридман МБ. *Отмена крепостного права в Белоруссии.* Минск: Издательство Белгосуниверситета; 1958. 202 с.
2. Улащик НН. *Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии.* Москва: Наука; 1965. 479 с.
3. Липинский ЛП. *Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии (II половина XIX в.)*. Минск: Наука и техника; 1971. 254 с.
4. Панютич ВП. *Историография аграрной истории Беларуси, 1861–1917 гг.* Минск: Институт истории НАН Беларуси; 2005. 262 с.
5. Панютич ВП. *Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861–1900 гг.* Минск: Навука і тэхніка; 1990. 375 с.
6. Касцюк М, рэдактар. *Гісторыя Беларусі. Том 4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.).* Мінск: Экаперспектыва; 2005. 519 с.
7. Ігнаценка ІМ, рэдактар. *Гісторыя Беларускай ССР. Том 2. Беларусь у перыяд капіталізму (1861–1917 гг.).* Мінск: Навука і тэхніка; 1972. 688 с.
8. Сташкевіч МС, рэдактар. *Гісторыя сялянства Беларусі: са старажытных часоў да 1996 г. Том 2. Ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г.* Мінск: Беларуская навука; 2002. 552 с.
9. Зайончковский ПА. *Проведение в жизнь крестьянской реформы 1861 г.* Москва: Издательство социально-экономической литературы; 1958. 470 с.
10. Каханоўскі АГ. Адмена прыгоннага права на тэрыторыі Беларусі: ход рэформы, яе наступствы і значэнне. *Беларускі гістарычны часопіс.* 2011;10:10–16.
11. Носевич ВЛ. *Традиционная белорусская деревня в европейской перспективе.* Минск: Тэхналогія; 2004. 350 с.
12. Даніловіч ВВ, рэдактар. *Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.)*. Мінск: Беларуская навука; 2020. 684 с.

[5] *Крачковский Ю. Ф.* Быт западнорусского селянина. М. : Унив. тип., 1874. С. 85.

13. Луговцова СЛ. Крестьянская реформа в Беларуси в воспоминаниях мировых посредников. У: Ходзін СМ, рэдактар. *Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны. Выпуск 7.* Мінск: БДУ; 2012. с. 37–48.
14. Каханоўскі АГ. *Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.).* Мінск: БДУ; 2013. 335 с.
15. Довнар-Запольский МВ. *Народное хозяйство Белоруссии, 1861–1914 гг.* Минск: Издательство Госплана БССР; 1926. 239 с.
16. Бурачонак АВ. Сацыяльны склад прамысловых прадпрымальнікаў Беларусі (канец XIX – пачатак XX ст.). У: Коршук УК, рэдактар. *Працы гістарычнага факультэта БДУ. Выпуск 6.* Мінск: БДУ; 2011. с. 20–26.

## References

1. Fridman MB. *Otmena krepostnogo prava v Belorussii* [The abolition of serfdom in Belarus]. Minsk: Izdatel'stvo Belgosuniversiteta; 1958. 202 p. Russian.
2. Ulashchik NN. *Predposylki krest'yanskoi reformy 1861 g. v Litve i Zapadnoi Belorussii* [Prerequisites of the peasant reform of 1861 in Lithuania and Western Belarus]. Moscow: Nauka; 1965. 479 p. Russian.
3. Lipinskii LP. *Razvitie kapitalizma v sel'skom hozyaistve Belorussii (II polovina XIX v.)* [Capitalist development of Belarusian agriculture, the second half of the 19th century]. Minsk: Nauka i tekhnika; 1971. 254 p. Russian.
4. Panyutich VP. *Istoriografiya agrarnoi istorii Belarusi, 1861–1917 gg.* [Historiography of the agrarian history of Belarus, 1861–1917]. Minsk: Institute of history of National Academy of Sciences of Belarus; 2005. 262 p. Russian.
5. Panyutich VP. *Sotsial'no-ekonomicheskoe razvitie belorusskoi derevni v 1861–1900 gg.* [Social and economic development of the Belarusian village in 1861–1900]. Minsk: Navuka i tjehnika; 1990. 375 p. Russian.
6. Kascjuk M, editor. *Gistoryja Belarusi.Tom 4. Belarus' u skladze Rasijskaj imperyi (kanec XVIII – pachatak XX st.)* [History of Belarus. Volume 4. Belarus as a part of the Russian Empire in the end of the 18th – the beginning of the 20th century]. Minsk: Jekaperspektyva; 2005. 519 p. Belarusian.
7. Ignacenka IM, editor. *Gistoryja Belaruskaj SSR. Tom 2. Belarus' u peryjad kapitalizmu (1861–1917 gg.)* [History of the Belarusian SSR. Volume 2. Belarus during the period of capitalism (1861–1917)]. Minsk: Navuka i tjehnika; 1972. 688 p. Belarusian.
8. Stashkevich MS, editor. *Gistoryja sjaljanstva Belarusi: sa starazhytnyh chasow da 1996 g. Tom 2. Ad rjeformy 1861 g. da sakavika 1917 g.* [History of the Belarusian peasantry from ancient times to 1996. Volume 2. From the reform of 1861 to March of 1917]. Minsk: Belaruskaja navuka; 2002. 552 p. Belarusian.
9. Zaionchkovskii PA. *Provedenie v zhizn' krest'yanskoi reformy 1861 g.* [Implementation of the peasant reform of 1861]. Moscow: Izdatel'stvo sotsial'no-ekonomicheskoi literatury; 1958. 470 p. Russian.
10. Kakhanouski AG. [The abolition of serfdom in Belarus: its implementation, consequences and importance]. *Belaruski gistarychny chasopis.* 2011;10:10–16. Belarusian.
11. Nosevich VL. *Tradicionnaya belorusskaya derevnya v evropeiskoi perspective* [The traditional Belarusian village in European perspective]. Minsk: Tjehnalogija; 2004. 350 p. Russian.
12. Danilovich VV, editor. *Sacyjal'na-ekanamichnae razviccjo Belarusi (kanec XVIII – pachatak XX st.)* [Social and economic development of Belarus in the end of the 18th – the beginning of the 20th century]. Minsk: Belaruskaja navuka; 2020. 684 p. Belarusian.
13. Lugovtsova SL. [The peasant reform in Belarus in the memories of conciliators]. In: Khodzin SM, editor. *Krynicaznawstva i specyjal'nyja gistarychnyja dyscypliny. Vypusk 7* [Source studies and auxiliary sciences of history. Issue 7]. Minsk: Belarusian State University; 2012. p. 37–48. Russian.
14. Kakhanouski AG. *Sacyjal'naja transfarmacyja belaruskaga gramadstva (1861–1914 gg.)* [Social transformation of the Belarusian society (1861–1914)]. Minsk: Belarusian State University; 2013. 335 p. Belarusian.
15. Dovnar-Zapol'skii MV. *Narodnoe khozyaistvo Belorussii, 1861–1914 gg.* [National economy of Belarus, 1861–1914]. Minsk: Izdatel'stvo Gosplana BSSR; 1926. 239 p. Russian.
16. Burachonak AV. [Social structure of industrial entrepreneurs of Belarus in the end of the 19th – beginning of the 20th century]. In: Korshuk UK, editor. *Pracy gistarychnaga fakul'tjeta BDU. Vypusk 6* [Proceedings of the faculty of history of the Belarusian State University. Issue 6]. Minsk: Belarusian State University; 2011. p. 20–26. Belarusian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 25.01.2021.*
*Received by editorial board 25.01.2021.*